с. 30]. Фаддей Венедиктович считал, что каждый человек должен посвящать больше времени самообразованию, нравственному совершенствованию, старательному выполнению своих обязанностей в семье и на службе, приобщению к отечественной истории и культуре [9, с. 137].

Уже будучи опытным человеком, он писал в 1854 г., что «деликатность души – присутствие в ней живого Бога!» [19, с. 598]. Отсутствие духовности ведет к нравственному падению общества. Журналист видел прямую связь между воспитанием отдельного человека и духовным состоянием всего общества. Будучи христианином по вероисповеданию, Ф. В. Булгарин часто подчеркивал значимость Евангелия, где, по его мнению, заключалась «истинная премудрость» и настоящая пища для души [20, с. 66].

Фаддей Булгарин занял в русском культурном контексте первой половины XIX в. исключительное место. В своих произведениях Ф. В. Булгарин выступал, в первую очередь, как просветитель. По его мнению, особенно важно было направлять образование молодого поколения и воспитывать его в духе патриотизма. Литератор смотрел в корень существовавших проблем. Он обличал малообразованность и невоспитанность, слепую погоню за модой и нелюбовь к родному языку и культуре. Фаддей Булгарин, сам постоянно стремившийся к новым знаниям, призывал посвящать больше времени самообразованию, нравственному совершенствованию, приобщению к отечественной истории и культуре. Честность и смелость нашего земляка откликалась российским читателям.


1. Рейтблат, А. И. Фаддей Булгарин: идеолог, журналист, консультант секретной полиции: статьи и материалы / А. И. Рейтблат – М. : Новое литературное обозрение, 2016. – 632 с.
2. Булгарин, Ф. В. Краткое обозрение русской литературы 1822 года / Ф. В. Булгарин // Северный архив. – 1823. – № 5. – С. 377–422.
3. Булгарин, Ф. В. Литературные призраки / Ф. В. Булгарин // Литературные листки. – 1824. – № 14. – С. 93–108.
4. Булгарин, Ф. В. Детский собеседник / Ф. В. Булгарин. – Ч. 1. – 1826. – 353 с.
5. Эконом, хозяйственная общеполезная библиотека / под ред. Ф. В. Булгарина. – Т. 5–6. – 1843. – 393 с.
6. Пшацлаўскі, В. Фаддей Бенедиктович Булгарин / В. Пшацлаўскі // Калейдаскоп успамінаў : у 2 т. // В. Пшацлаўскі ; уклад., прадм., камент. і імен. паказ. А. Фядуты ; навук. рэд. камент. А. Рэйтблат. – Мінск : Лімарыус, 2012. – Т. 2. – С. 212–229.
7. Булгарин, Ф. В. Провинциал в обществе большого света / Ф. В. Булгарин // Северная пчела. – 1825. – 24 января.
8. Киселев, А. П. История оформления русской газеты (1702–1917 гг.) / А. П. Киселев. – Москва : Изд-во Московского ун-та, 1990. – 192 с.
9. Булгарин, Ф. В. Дурные времена. Очерки русских нравов / Ф. В. Булгарин. – М. : Азбука, 2007. – 368 с.
10. Булгарин, Ф. В. Досуг и недосуг / Ф. В. Булгарин // Северная пчела. – 1825. – 6 января.
11. Булгарин, Ф. В. Званый обед / Ф. В. Булгарин // Северная пчела. – 1826. – 6 июля.
12. Булгарин, Ф. В. Хладнокровное путешествие по гостиным / Ф. В. Булгарин // Северная пчела. – 1825. – 5 ноября.
13. Булгарин, Ф. В. Всемирный коммерческий перелом, или кризис (окончание ) / Ф. В. Булгарин // Северная пчела. – 1837. – 7 июля.
14. Булгарин, Ф. В. Урок фанфаронам и ветреникам / Ф. В. Булгарин // Северная пчела. – 1826. – 27 апреля.
15. Булгарин, Ф. В. Провинциал в обществе большого света: (Похождение второе) / Ф. В. Булгарин // Северная пчела. – 1825. – 24 января.
16. Булгарин, Ф. В. Народные увеселения на Святой неделе / Ф. В. Булгарин // Северная пчела. – 1827. – 9 апреля.
17. Булгарин, Ф. В. Беседа в гостинном дворе / Ф. В. Булгарин // Северная пчела. – 1840. – 15 октября.
18. Булгарин, Ф. В. Невероятные небылицы, или Путешествие к средоточию Земли / Ф. В. Булгарин // Полное собрание сочинений Фаддея Булгарина. – Т. 7 : Нравы. Нравы и словесность. История и нравы. – СПб. : М.Д. Ольхин, 1844. – С. 17–30.
19. Видок Фиглярин: письма и агентурные записки Ф. В. Булгарина в III отделение / публ., сост., предисл. и коммент. А. И. Рейтблата. – М. : НЛО, 1998. – 704 с.
20. Булгарин, Ф. В. Лицевая сторона и изнанка рода человеческого / Ф. В. Булгарин. – М. : Азбука, 2007. – 550 с.


**Гладкова Г.А.**

## АДЛЮСТРАВАННЕ СТАНОВІШЧА ЛІТВІНСКАЙ ШЛЯХТЫ Ў РАМАНЕ ЕВЫ ФЯЛІНСКАЙ “ПЛЯМЕННІЦА І ЦЁТКА”

Ева Фялінская – польскамоўная пісьменніца XIX стагоддзя, якая нарадзілася ў 1793 годзе ў збяднелай шляхецкай сям'і Вяндорфаў у фальварку Узнога недалёка Клецка. Рана страціўшы бацьку, дзяўчынка выхоўвалася набожнай маці. Яе юнацтва прайшло ў Слуцку, у Барысаве Е. Вяндорф сустрэла будучага мужа – Герарда Фялінскага. У хуткім часе маладая сям'я пераехала на Палессе, пазней – на Валынь, дзе знаходзілася сядзіба мужа (Ваюцін). У 1833 годзе памірае муж Фялінскай, на яе руках засталося шасцёра дзяцей і хворая паралізаваная маці. Неўзабаве будучая пісьменніца пераехала з роднымі ў Крамянец, дзе ўвайшла ў асяроддзе, якое ставіла агульнае дабро вышэй за прыватныя інтарэсы, клапацілася пра маральнае ўдасканаленне шляхты, лічыла працу найгалоўнейшым абавязкам грамадскага жыцця. Кожны з членаў таварыства лічыў неабходнымі роўнае абыходжанне са слугамі і сялянамі, працу па іх маральнаму выхаванню і разумоваму ўдасканаленню з дапамогай школ, кніг і ўласнага прыкладу. Практыкавалася ашчаднасць ва ўсім, сэканомленыя грошы павінны ўжывацца для грамадскіх патрэб. Арыштаваная царскімі ўладамі Е. Фялінская была саслана ў Сібір (Табольская губернія, Бярозаў), тры гады жыла і займалася літаратурнай дзейнасцю ў Саратаве. Важнай крыніцай, якая ўтрымлівае апісанне высылкі, з'яўляюцца мемуары пісьменніцы “Успаміны аб падарожжы па Сібіры і побыце ў Бярозаве”. Як адзначаў А. Мальдзіс, *“назіранні над побытам навакольнай шляхты далі пісьменніцы матэрыял для двух-*

*томнай аповесці "Гарсылія" (Вільня, 1849)* [2, с. 189]. Акрамя гэтага, польскамоўны трохтомнік "Дзённікі Евы Фялінскай" (Вільня, 1856) можа разглядацца як змястоўны дакумент эпохі.

Друкавацца Е. Фялінская пачала з артыкула ў "Пецярбургскім штотыднёвіку" у 1843 г. пад псеўданімам *Weneranda Kokosz*. Першы раман "Siestrzenica i ciotka" ("Пляменніца і цётка") пісьменніца даслала аўтарытэтнаму на літвінскіх і беларускіх землях крытыку Міхалу Грабоўскаму. Крытык не назваў твор дасканалым, але адзначыў, што ён не горшы за тую прозу, якую пішуць польскія пісьменніцы-сучасніцы Фялінскай. Крытык даў параду больш працаваць над індывідуальнасцю мастацкіх вобразаў, пашырыць апісанні краявідаў, добра знаёмых аўтарцы, засяроджваць увагу на мясцовых бытапісальных элементах. Неўзабаве з-пад пяра Фялінскай з'явіліся наступныя раманы "Pan Deputat" ("Пан Дэпутат") і "Hercylia" ("Герцылія").

Сюжэты твораў Фялінскай, як правіла, заснаваныя на ўспамінах маладосці, аўтарка, не схільная да ідэалізацыі, імкнулася крытычна, максімальна аб'ектыўна адлюстроўваць рэчаіснасць у сваіх творах. Падзеі ў раманах Фялінскай адбываюцца ў першай трэці XIX стагоддзя на Літве і Валыні. Галерэя мастацкіх вобразаў утрымлівае харунжых, падкаморы, маршалкаў, шамбелянаў, апісаны літвінскі і польскі строй у процівагу французскай модзе. Падзейны бок твораў складаюць імяніны, балі, забавы шляхты, разам з гэтым – эксдывізія маёнткаў шляхты, якая больш трацiла, чым збірала, брала пазыкі і не мела магчымасці расплаціцца. І ўсюды пісьменніца акцэнтуе ўвагу на праблемных пытаннях рэчаіснасці: занядбанні маёнткаў, няздольнасці шляхты эфектыўна весці гаспадарку, на распаўсюджванні ашуканства і крыміналу, на які пускаюцца людзі, надзеленыя капіталам і ўладай, адным словам, адлюстраваны разлад сямейных і грамадскіх стасункаў. Цёмны, пануры каларыт рэдка разбаўлены малюнкамі шчасця ці радасці. Думаецца, недахопам раманаў Е. Фялінскай можна назваць некаторую кампазіцыйную недапрацаванасць, у выніку чаго драматычныя эпізоды губляюцца ў шматлікіх прыватных дробязях мясцовага жыцця: чытачу складана вызначыць мастацкасць твора, якая перабіваецца хронікай правінцыйных чутак. Таксама частае пераключэнне чытацкай увагі з адной сюжэтнай лініі на іншую не спрыяе цэласнаму ўспрыманню сюжэта. Псіхалагічны аналіз і апісанне прыродных вобразаў не ўваходзяць у мастацкі арсенал Фялінскай.

У рамане "Пляменніца і цётка" аўтарка паставіла на мэце адлюстраванне занядбання, выраджэння магнатэрыі на Літве пачатку XIX стагоддзя. З палітычным упадкам краю сталі разрывацца сувязі заможных магнатаў з дробнай шляхтай: кожны пачаў жыць аднаасобна, толькі для сябе. Магнаты пераставалі апекавацца над дробнай шляхтай, шукаючы яе прыхільнасць і службу, сяброўскіх стасункаў паміж імі адбыцца не магло па прычыне таго, што магнаты адрозніваліся ад мясцовай шляхты замежным выхаваннем, "замкнуўшы перад дробнай шляхтай свае дзверы" і пазбавіўшы яе матэрыяльнай падтрымкі, як зазначае Фялінская, магнаты працягвалі патрабаваць у свой бок былога шанавання, што абурыла шляхту, якая ўжо не адчувала абавязку ўдзячнасці, які захоўваўся раней. Магнаты, пазбаўленыя былога палітычнага ўплыву, рушылі на Захад, у Еўропу, адкуль на Літву прывозілі новыя культурныя традыцыі. Патрэбы войнаў, якія праводзіў Напалеон, вымагалі павелічэнне гандлю збожжам і драўнінай, што прывяло да наплыву грошай. Павелічэнне прыбыткаў павялічвала траты: шляхта актыўна пачала карыстацца крэдытамі. Аднак з-за мер, прынятых Напалеонам (закрытыя порты Еўропы), Англія ў хуткім часе вымушана была шукаць іншыя шляхі для атрымання неабходных тавараў. У выніку гандаль Літвы збавіў тэмп, пачалася стагнацыя, прыток грошай у краіну зменшыўся. Надышоў час банкруцтва і заняпаду шляхецкіх гаспадарак. Пачаліся шматлікія эксдывізіі – разборы шляхецкай маёмасці. Як адзначыў І. Гушчынскі, *"нейкага цэльнага законапалажэння аб эксдывізіях не існавала. Эксдывізарскі судовы працэс вызначаўся галоўным чынам не пісаным правам, а традыцыяй, якая склалася на практыцы"* [1, с. 37]. Гэта часта вяло да ашуканства, паказвала не лепшыя бакі чалавечай псіхалогіі. Даўжнікі спекулявалі на веры сваіх крэдытораў, апошнія таксама вялі змовы з суддзямі не на карысць даўжніка. Е. Фялінская не сумнявалася, што натхнёныя прыкладамі вялікіх продкаў, пра якіх паведамляюць сямейныя паданні, магнаты яшчэ могуць адрадзіцца ў трэцім ці чацвёртым пакаленні і зноў быць узорам дабрачыннасці.

У рамане прадстаўніком магнатаў, якія прыйшлі да заняпаду, стаў пан Саматульскі. Ён пагарджае дробнай шляхтай, як трапна азначыла яго характар пісьменніца, *"сібарыт у маладосці, эгаіст у старасці"* [3, с. 43–44]. Шляхта яго не любіла і не шанавала, але гэта акалічнасць яго мала цікавіла: Саматульскі жыў, як лічыў патрэбным. Дэспатычны бацька, ён меў 40-гадовага сына, хворага на эпілепсію, відавочна, па прычыне жорсткага абыходжання з ім, і 30-гадовую дачку, не здольную на праявы эмоцый, марай якой было як мага хутчэй пакінуць бацькоўскі дом.

Прадстаўнік шляхетнага магната – Чэслаў Т., які па каханні ажаніўся з небагатай паненкай, добра ставіцца да падданых, падтрымлівае прыязныя стасункі са шляхтай, дапамагае ёй; гераіню рамана Караліну, дачку той, якую калісьці кахаў, бярэ пад апеку пасля смерці яе бацькі, прыклаў намаганні, каб выйграць справу і вярнуць Караліне спадчынны маёнтак, падтрымаў паненку знач-

най колькасцю грошай. Думаецца, пры стварэнні гэтага мастацкага характару большае значэнне мелі ідэалізаваныя ўяўленні аўтаркі, чым тагачасная рэальнасць.

Сярод мастацкіх характараў рамана вылучаецца вобраз Ізабэлы. З дзяцінства сірата, яна не вызначалася прыгожай знешнасцю, але мела добрае сэрца. Яе філантропія, схільнасць клапаціцца пра іншых часам перашкаджаюць людзям, замінаюць у многіх сітуацыях. Увогуле жаночыя тыпы рамана вызначаюцца некаторай аднатыповасцю: пісьменніца кіруецца традыцыйнымі ўяўленнямі пра сучасніц, часам стварае ідэалізаваных гераінь, здольных на самую высокую ступень самаахвярнасці (вобраз дачкі стольніка Людвікі Шашкоўскай). Аднак, Е. Фялінская вылучыла і новыя тэндэнцыі ў тагачасным грамадскім жыцці, напрыклад, некаторым гераіням яе твораў, і, у прыватнасці, рамана "Пляменніца і цётка", уласцівае імкненне да самастойнасці. Павевы эмансіпацыі даходзілі да маёнткаў на Літве, французская літаратура несла такія ідэі чытачкам, невыпадкова ў творы згадваецца імя Жэрмэны дэ Сталь, а ў характары пані Браніславы падкрэслены рысы самастойнасці і імкнення да самарэалізацыі.

Пісьменніцу хвалявала праблема маральнасці, сумленнасці ў сітуацыях, калі справа датычыла фінансаў. Так, у рамане ёсць эпізод, калі гераіня не жадае падзяліцца з роднай сястрой атрыманай спадчынай насуперак тэстаменту. Фялінская паказвае, як пагоня за матэрыяльным прыбыткам разбураюча ўздзейнічае на норавы людзей, іх маральную зніТаванасць.

Пісьменніца са спачуваннем ставілася да прыгонных беларускіх сялян, на якіх панства глядзела толькі як на капітал. Аднак і сярод большасці такіх прадстаўнікоў шляхты знаходзіліся тыя, хто валодаў прагрэсіўнымі поглядамі на грамадства, імкнуўся ва ўласнай гаспадарцы будаваць адносіны з сялянамі на прынцыпах павагі чалавечай годнасці. Менавіта народ Е. Фялінская назвала крыніцай, якая здольная даць сілы айчынным гаспадаркам.

XIX стагоддзе стала часам нараджэння гатычнага рамана ў еўрапейскіх літаратурах (творы А. Радкліф, Г. Уолпала і інш.). Паказальна, што моднымі ў мастацкіх творах становяцца містыфікацыі, гэта, як вядома, працуе на займальнасць сюжэта. У рамане "Пляменніца і цётка" таксама ёсць эпізод, які паказвае злучанасць у свядомасці чалавека рэальнага і інфернальнага, пазасвядомага. Атрыбуты гатычнага рамана (*ноч, скрыня з рэліквіямі, прывіды, патаемныя дзверы і пакой, ажываючы партрэт і інш.*) ствараюць блізкую да жаху атмасферу, што мяняе агульны апавядальны тон кнігі. Дарэчы, гістарычныя рэліквіі, якія захоўваў пан Падкаморы, ускосна характарызуюць героя як чалавека вернага традыцыям продкаў. Да рэліквій належаць: пяро, якім Ян Кахаnoўскі пісаў знакамітыя "Трэны", стрэмя ад сядла Яна III, аброць каня Стэфана Баторыя часу аблогі Пскова, шлем Станіслава Жалкеўскага. Думаецца, Е. Фялінская невыпадкова абірае прадметы мінулай эпохі, якія ў свядомасці чытача асацыіруюцца з былой славай Рэчы Паспалітай. У гэтым бачыцца спроба актывізацыі гістарычнай памяці, нацыянальнай свядомасці, што можа спрыяць духоўнаму і маральнаму аднаўленню сучаснікаў.

Такім чынам, раман Евы Фялінскай "Пляменніца і цётка" служыць адлюстраваннем грамадскага стану на Літве і Беларусі ў першай трэці XIX стагоддзя, а таксама прыцягвае ўвагу да эканамічных праблем, з якімі сутыкнулася мясцовая шляхта ў адзначаны перыяд. Пісьменніцкі клопат пра маральную сферу стасункаў суайчыннікаў дэманструе неабыякавасць аўтаркі да актуальных праблем рэчаіснасці, з наступствамі каторых прыходзілася сутыкацца шляхце літвінска-беларускіх земляў у другой палове XIX стагоддзя.


1. Гушчынскі, І. Г. Эксдывізарскія суды ў эканамічным жыцці Беларусі ў першай трэці XIX стагоддзя / І. Г. Гушчынскі // «Долгий XIX век» в истории Беларуси и Восточной Европы: исследования по Новой и Новейшей истории : сб. науч. тр. Вып. 2 / редкол.: И. А. Марзалюк (пред.) [и др.]. – Минск : РИВШ, 2018. – С. 37–41.
2. Мальдзіс, А. Падарожжа ў XIX стагоддзе: з гісторыі беларускай літаратуры, мастацтва і культуры: навук.-папул. нарысы / А. Мальдзіс. – Мінск : Народная асвета, 1969. – 206 с.
3. Felińska, E. Siestrzenica i ciotka : powieść obyczajowa / E. Felińska. – Wilno, 1853. – 312 s.



**Сафронов П.М.**


## «ТРУДЫ» И.Т. ВЕРХОВСКОГО, ОСНОВОПОЛОЖНИКА ЕДИНОВЕРЧЕСКОГО БОГОСЛОВИЯ

Раскол Русской церкви середины XVII в. имел серьезные последствия, затронувшие разные сферы общественной жизни: духовной, культурной, экономической, политической и повседневной. Камнем преткновения стали вопросы духовные: богословские и обрядовые. Чем больше времени проходило от начала раскола, тем больше у старообрядцев появлялось ветвей, толков и согласий. Вопрос о возвращении в лоно официальной Православной церкви изначально поднимался ее представителями. Затем такая необходимость появилась и у представителей разных толков старообрядчества. И с одной, и с другой стороны были как сторонники, так и противники объединения. Единоверческие процессы весь период раскола выступают ключевым аспектом взаимоотношений старообрядчества